# Прэзідэнт
# Рэспублікі Беларусь

Мінск, 14 ліпеня 2021 года

Дарагія сябры,

Сардэчна віншую ўвесь французскі народ з Нацыянальным святам Французскай Рэспублікі – 14 Ліпеня.

Ваша дзяржава іграе асаблівую ролю ў Еўропе і свеце, робіць неацэнны ўклад у справе бяспекі, развіцця гуманітарнага супрацоўніцтва і міжчалавечых кантактаў. Мы ўдзячны звычайным французам за іх шчырыя сэрцы, дапамогу і светлыя пачуцці да Беларусі.

У гэтым годзе нашы краіны адзначаюць гадавіны значных падзей дзвюх сусветных войнаў, якія знішчылі дзясяткі мільёнаў чалавечых лёсаў. Трэба памятаць такія старонкі гісторыі, каб зразумець, якую высокую цану нашы народы заплацілі за незалежнасць. Быць асцярожнымі і разважлівымі, імкнучыся за кімсьці да змен, каб пад гэтым сцягам не страціць больш, чым набыць.

Выстаяць, вярнуцца да нармальнага ладу жыцця нашым продкам дапамаглі вялізная любоў да сваёй радзімы, узаемная падтрымка, разуменне адзін аднаго. Многія беларусы ваявалі за Францыю, французскія браты адстойвалі нашу беларускую зямлю. Мы, нашчадкі пераможцаў, памятаем, цэнім і ганарымся гэтым.

У святочны дзень жадаю народу Французскай Рэспублікі салідарнасці, упэўненасці ў заўтрашнім дні і мірнага неба над галавой.

Аляксандр Лукашэнка

**Народу Французскай Рэспублікі**